# Голас Радзімы

№ 49 (2139)
7 снежня 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ (БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



**ДЗЯРЖАЎНАМУ** мастацкаму музею БССР споўнілася 50 гадоў. Нештодзённая падзея ў культурным жыцці Беларусі, якая прымушае задумацца аб многім. У фондах гэтага храма мастацтва і яго экспазіцыях сабрана ўсё лепшае, што створана многімі пакаленнямі беларусаў. Супрацоўнікі музея, спецыялісты высокай кваліфікацыі, шукаюць і знаходзяць новыя формы работы з гледачамі, скарыстоўваюць усе магчымасці для прапаганды выяўленчага мастацтва. Але ў музея нямала і пякучых праблем...

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

На чарговым пасяджэнні ЦК КПБ была падтрымана прапанова Савета Міністраў БССР аб правядзенні ў Мінску з 24 па 27 мая 1990 года Усесаюзнага свята славянскай пісьменнасці і культуры. Мінскім абкому і гаркому КПБ даручана аказаць неабходнае садзейнічанне ў падрыхтоўцы і правядзенні свята яго арганізатарам.

Бюро ЦК КПБ адобрыла ўнесеныя рэспубліканскім аргкамітэтам мерапрыемствы, прысвечаныя 100-годдзю з дня нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча. У гонар гэтага юбілею, святкаванне якога адбудзецца ў другой палавіне 1991 года, намечана правесці спецыяльную сесію Акадэміі навук БССР, урачыстыя вечары прадстаўнікоў працоўных калектываў і грамадскіх арганізацый у Мінску і Гродне, свята паэзіі, мастацкія і кніжныя выстаўкі, літаратурныя вечары, конкурсы. Прадугледжаны шэраг мер па далейшаму ўвекавечанню памяці паэта.

На пасяджэнні разгледжаны прапановы камісіі Бюро ЦК Кампартыі Беларусі па дадатковаму вывучэнню матэрыялаў, звязаных з рэпрэсіямі, якія мелі месца ў перыяд 30—40-х і пачатку 50-х гадоў, і камісіі партыйнага кантролю пры ЦК КПБ аб прыналежнасці да партыі некаторых асоб, неабгрунтавана выключаных з яе радоў і прыцягнутых да крымінальнай адказнасці па палітычных матывах, а затым рэабілітаваных у судовых адносінах. Рашэннем Бюро ЦК КПБ адноўлены (пасмяротна) у КПСС з моманту ўступлення ў партыю:

Гісіч Мікалай Мікалаевіч — былы дырэктар рэчыцкай раённай канторы «Белплодаагародніна»;

Кучынскі Аляксандр Сямёнавіч — былы загадчык парткабінета Добрушскага райкома партыі;

Любецкі Фёдар Антонавіч — былы дырэктар саўгаса «Вязань-Фаніпаль» Дзяржынскага раёна;

Мальчык Фелікс Андрэевіч — былы дырэктар Бабруйскага фанернага завода імя Кірава;

Фарнальскі Лявон Антонавіч — былы рабочы (г. Мінск);

Шаранговіч Ілья Фаміч — былы намеснік дырэктара Першамайскай МТС Сенненскага раёна.

На пасяджэнні ЦК КПБ былі разгледжаны і іншыя пытанні.

БРЫФІНГ

## ЗА СЯМЮ ПЯЧАЦЯМІ

Яшчэ нядаўна гэтая тэма была тайнай за сямю пячацямі. Крайне рэдка даводзілася журналістам расказваць пра жыццё і быт злачынцаў, змешчаных па прыгавору суда ў папраўча-працоўныя ўстановы. Цяпер покрыва сакрэтнасці знята, і грамадскасць упершыню даведалася пра колькасць тых, хто адбывае тэрмін пакарання. У краіне іх каля васьмісот тысяч, у Беларусі — чатырнаццаць тысяч. Такія лічбы назваў на брыфінгу, праведзеным для работнікаў сродкаў масавай інфармацыі рэспублікі, намеснік міністра ўнутраных спраў БССР Б. Матусевіч.

На тэрыторыі рэспублікі размешчаны дзве калоніі агульнага рэжыму, чатыры ўзмоцненага, пяць строгага, адна асобага, дзве выхаваўча-працоўныя, у якіх адбываюць тэрмін падлеткі, восем лячэбна-працоўных прафілакторыяў. Цікавы ўзроставы склад злачынцаў: 34 працэнты асуджаных — ва ўзросце да 25 гадоў, тых, каму больш за шэсцьдзесят, — 1,5 працэнта.

Апошнім часам злачыннасць рэзка ўзрасла, аднак колькасць асуджаных зменшылася. Гэта адбываецца ў сувязі з гуманізацыяй законаў, стварэннем прававой дзяржавы. Суды сталі больш прымяняць меры пакарання, не звязаныя з пазбаўленнем волі. Два гады назад у сувязі з амністыяй было вызвалена шмат асуджаных, многім з іх скарочаны тэрмін. Дастаткова сказаць, што амністыя закранула амаль 70 працэнтаў тых, хто адбываў пакаранне па прыгавору суда ў папраўча-працоўных установах Беларусі.

У калоніях арганізаваны вячэрнія школы, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, дзе праводзіцца падрыхтоўка па рабочых спецыяльнасцях. Вытворчыя магутнасці, існуючыя ў сістэме папраўчых установ рэспублікі, выпускаюць тавары народнага спажывання, прамысловую прадукцыю на 240 мільёнаў рублёў у год. Гэтыя сродкі ідуць у дзяржаўны бюджэт.

ПРАФСАЮЗЫ

## АБАРАНЯЦЬ ІНТАРЭСЫ ПРАЦОЎНЫХ

Аўтарытэт заваёўваецца справай. Глыбокае ўсведамленне гэтай ісціны выказалі прафсаюзныя актывісты, якія выступілі на VII пленуме Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў, што адбыўся ў Мінску.

Перабудоўваючы сваю работу, сканцэнтроўваючы намаганні на галоўным — абароне законных правоў і інтарэсаў працоўных, прафсаюзы жыццёва зацікаўлены ў рэальным удзеле ў выпрацоўцы і прыняцці заканадаўчых і кіраўніцкіх рашэнняў. Такую магчымасць дае прадстаўніцтва ў органах народаўладдзя. На прайшоўшым пленуме Белсаўпрофа і былі абмеркаваны перадвыбарная платформа і тактыка ўдзелу прафсаюзаў у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў.

Зацікаўленая канструктыўная размова адбылася ў ходзе абмеркавання перадвыбарнай платформы. Сутнасць яе заключаецца ў тым, што прафсаюзы маюць намер настойліва дабівацца хутчэйшага вырашэння вострых праблем, павышэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва рэспублікі. Так, напрыклад, у праграму закладзены патрабаванні да ўрада рэспублікі — прыняць дзейсныя меры па стрымліванню росту цэн на тавары першай неабходнасці. Прафсаюзы выступаюць за перагляд дзеючага працоўнага заканадаўства, прапануюць увесці 40-гадзінны пяцідзённы рабочы тыдзень і мінімальны чарговы водпуск працягласцю чатыры каляндарныя тыдні.

Пасля ўсебаковага абмеркавання пленум прыняў зварот да працоўных калектываў і прафсаюзных арганізацый Беларусі ў сувязі з выбарамі народных дэпутатаў БССР і мясцовых органаў улады.

ПАМЯЦЬ



Мінскія школьнікі гулялі на палянцы каля лесу непадалёку ад вёскі Цнянка. У паўзасыпаным старым акопе яны заўважылі ствол вінтоўкі, што тарчаў з зямлі. А ў час раскопак выявілі дзесяць чалавечых чэрапаў і іншыя астанкі. Тут жа былі знойдзены рэшткі адзення, абутку, пластмасавы муштук, кішэннае люстэрка, савецкія манеты 1932 — 1939 гадоў выпуску.

Так школьныя следапыты выявілі пахаванне савецкіх воінаў, якія абаранялі ў чэрвені 1941 года Мінск. Прозвішчы загінуўшых невядомыя: запіску, што знаходзілася ў пластмасавай капсуле-медальёне, у крыміналістычнай лабараторыі прачытаць не ўдалося.

У пацвярджэнне таго, што гэта былі астанкі савецкіх воінаў, гавораць знойдзеныя пры раскопках зброя і рэчы, савецкія грошы. Акрамя таго, мясцовыя жыхары расказвалі, што ў апошнія дні чэрвеня на палянцы ў лесе ішоў бой, пасля якога гітлераўцы загадалі старым засыпаць зямлёй у акопе загінуўшых савецкіх салдат.

Выканком Мінскага раённага Савета народных дэпутатаў пасля стараннага вывучэння ўсіх акалічнасцей прыняў рашэнне перазахаваць астанкі абаронцаў Мінска ў брацкай магіле на перакрыжаванні дарог каля Астрашыцкага Гарадка.

НА ЗДЫМКУ: у час жалобнага мітынгу.

КААПЕРАЦЫЯ

## КОЛЬКІ КАШТУЕ ІНФАРМАЦЫЯ

Значэнне інфармацыі цяжка пераацаніць. Заходнія бізнесмены падлічылі: з-за яе недахопу страчваецца да 10 працэнтаў прыбытку. У нас у краіне такія даследаванні не праводзіліся, але мяркуецца, лічба будзе больш значнай.

Дапамагчы ліквідаваць дэфіцыт інфармацыі заклікана выстаўка-кірмаш тавараў народнага спажывання і паслуг, якія выконваюцца кааператывамі і дзяржаўнымі прадпрыемствамі Мінска і вобласці.

Адна з галоўных мэт, якую ставілі арганізатары выстаўкі — мінскія абласны і гарадскі выканкомы, — паказаць магчымасці прадпрыемстваў і кааператываў у насычэнні рынку таварамі народнага спажывання і платнымі паслугамі.

Дыяпазон паслуг, якія прапаноўваюцца, шырокі, але галоўная праблема, над якой працуюць тут цяпер, — стварэнне міжгаліновага цэнтра рэсурсазберажэння. Сумесна з асацыяцыяй дзелавога супрацоўніцтва «Гарант» і Дзяржзабеспячэннем БССР распрацоўваецца шырокая праграма выкарыстання мільёнаў тон адходаў вытворчасці, што накапіліся на прадпрыемствах рэспублікі, стварэння банка інфармацыі пра спосабы іх перапрацоўкі.

У «Цэнтры» арганізавана група сацыёлагаў-камівояжораў, якая прафесіянальна займаецца вывучэннем магчымасцей кааператываў. Гэта маладыя хлопцы, студэнты інстытутаў, якія прайшлі спецыяльны курс навучання па сацыялогіі, фінансаваму, кааператыўнаму праву, афармленню дагавораў.

РАЗВІЦЦЁ ВЫТВОРЧАСЦІ

## КІСЯЯ З ХІМІЧНЫХ ЦЭХАЎ

Усе гардзінныя фабрыкі нашай краіны здольная забяспечыць пражай новая вытворчасць, уведзеная ў строй у магілёўскім аб'яднанні «Хімвалакно». Яе гадавая магутнасць — 3 тысячы 800 тон поліэфірных тэкстыльных ніцей, прызначаных для выпуску тонкага гардзіннага палатна. Высокапрадукцыйны хімічны комплекс, дзе выпрацоўваецца пража, пабудаваны сумесна з фірмай «Тэкстыма» Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

Увод яго ажыццёўлены дакладна ў тэрмін, прадугледжаны кантрактам. Атрыманыя гардзінныя ніці па ўсіх тэхналагічных параметрах адпавядаюць сусветным стандартам. Вядома, у ходзе мантажу і наладкі абсталявання, як на ўсякай новай вытворчасці, былі цяжкасці. Але нямецкія і савецкія спецыялісты знаходзілі агульную мову і поўнае ўзаемаразуменне.

Разам з абсталяваннем па выпуску ніцей «Тэкстыма» паставіла магілёўчанам 24 вязальныя машыны для вытворчасці саміх гардзін. У суседнім цэху ўсё гэта абсталяванне таксама запушчана ў работу.

ДА ЮБІЛЕЮ СКАРЫНЫ

## АЖЫЛА ГІСТОРЫЯ

Першыя арыгінальныя сувеніры да маючага адбыцца 500-гадовага юбілею Францыска Скарыны падрыхтаваны Полацкай фабрыкай мастацкіх вырабаў. Драўляныя скульптуркі з адлюстраваннем выдатнага асветніка сярэдневякоўя, выкананыя народным умельцам Анатолем Міхеенкам, прыгожыя пано ўжо папоўнілі зборы калекцыянераў, сталі памятным набыткам для гасцей горада.

Не абяднела старыжытная полацкая зямля на таленавітых майстроў. З глыбіні вякоў фантазіяй землякоў вялікага палачаніна выкліканы хвалюючыя сюжэты і цікавыя роспісы. Прафесійныя мастакі, мастацтвазнаўцы і гісторыкі сумесна з халвальнікамі сакрэтаў традыцыйных старажытных рамёстваў — рэзчыкамі па дрэву, ткачамі, кавалямі, ганчарамі — арганізавалі своеасаблівую талаку па адраджэнню народных промыслаў. Ролю каардынатара ўзяла на сябе полацкая фабрыка.

ДЗЯРЖАВА І РЭЛІГІЯ

## МАЛІТВЫ І ЭКСКУРСІІ

Настаяцель Свята-Пакроўскага сабора ў Гродне айцец Уладзімір павіншаваў мясцовых прыхаджан з вяртаннем іх прыходу адразу двух культавых будынкаў. Рашэннем аблвыканкома яму перададзены пабудаваная ў XII стагоддзі Барысаглебская (Каложская) царква і капліца на могілках па вуліцы Антонава, вядомая яшчэ пад назвай царквы прападобнай Марфы.

Абодва будынкі, якія належалі раней музею атэізму і гісторыі рэлігіі, пасля заканчэння тут рэстаўрацыйных работ зноў прымуць прыхаджан. А арыгінальны ўзор старажытнага дойлідства — Каложскую царкву — ва ўстаноўленыя дні змогуць наведваць, як і раней, экскурсанты.

НОВАЯ ПРАДУКЦЫЯ

## НАПІТАК З КРАПІВЫ

Крапіва, аб лекавых уласцівасцях якой у народзе вядома здаўна, знайшла яшчэ адно прымяненне — у выглядзе напітку з той жа назвай. Яго вытворчасць асвоіў Барысаўскі завод безалкагольных напіткаў.

Асноўны кампанент навінкі — настой з гэтай травы, які мае прафілактычнае дзеянне. Дзякуючы наяўнасці розных вітамінаў яго ўжыванне зніжае працэнт цукру ў крыві, павялічвае колькасць гемаглабіну і эрытрацытаў.

## *ВЫДАННІ «ГОЛАСУ РАДЗІМЫ»*




Прадстаўляць чытачу аўтара новай кніжкі, выдадзенай у «Бібліятэчцы газеты «Голас Радзімы», Мар'яна Віжа (Мар'яна Зайцава) мне цяпер лягчэй: у двух папярэдніх нумарах нашага выдання друкаваўся яго нарыс пра Ракаў—«Гарадок майстроў». Так што можна ўжо мець першае ўяўленне пра кола інтарэсаў аўтара, яго стаўленне да прадмета даследавання, манеру і стыль пісьма. «Гарадок майстроў»—адзін з чатырох гісторыка-публіцыстычных нарысаў, якія і склалі кніжку Мар'яна Віжа «Чары даўніны». Нас яшчэ чакаюць цікавыя і такія ж пазнавальныя вандроўкі ў недалёкі ад Ракава слынны Івянец, у цэнтры аднайменных раёнаў Чэрвень і Лагойск.

Чаму выбраны менавіта гэтыя былыя мястэчкі, а не іншыя? Прадбачачы такое правамернае пытанне, аўтар піша ў прадмове: «Кропкі на карце Міншчыны (у межах былой Мінскай губерні) выбіраліся адвольна, з адзіным намерам паспрабаваць прачытаць яшчэ зусім невядомыя ці амаль забытыя старонкі багатай гісторыі роднага краю». Апошнія словы цытаты якраз і гавораць пра абсяг інтарэсаў гісторыка і літаратара Мар'яна Віжа—малыя гарадкі Беларусі; праз падзеі ў іх, праз канкрэтных людзей, імёны і справы якіх удалося «адкапаць» у архівах, пачуць ад старых людзей тых жа мястэчак, нам адкрываецца Спадчына, тое, што пакінулі сучаснаму пакаленню продкі нашы, тое, што, калі не ўсе, то большасць з нас, не надта шанавалі да апошняга часу.

На жаль, мы выхаваны ў нігілізме да нацыянальнай спадчыны і таму ўпэўнены, што да 1917 года на нашай зямлі былі толькі ўціск, галота, слёзы, што гісторыя наша пачынаецца толькі з Кастрычніцкай рэвалюцыі. Так, усё гэта было ў нашай дарэвалюцыйнай гісторыі, не пярэчым, але было і само жыццё многіх пакаленняў беларусаў з яго горам і радасцю, са змаганнем, паражэннямі і перамогамі, з невуцтвам і імкненнем да святла ведаў. Было столькі магутных, духоўна багатых постацяў нашых продкаў! І мы павінны ганарыцца нашай Спадчынай. Мы маем на гэта права, бо, як адзначае аўтар, беларуская спадчына непараўнальна багацейшая за стандартна-сціплыя ўяўленні аб ёй. Не будзем жа занадта сарамлівымі і ўслед за аўтарам «Чараў даўніны» голасна скажам: «Залаты фонд еўрапейскіх і сусветных дасягненняў наш адносна нешматлікі народ узбагаціў важкімі гуманістычнымі скарбамі». Гэта слушна і на часе сказана.

Але дапытлівы чытач і тут нас можа «прыперці» пытаннем: «Нацыянальная спадчына і мястэчка! Ці не занадта гэта несупаставімыя велічыні?» Сапраўды, можа лепш прайсціся па сталічным асфальце, павандраваць па нашых абласных гарадах? Аднак Мар'ян Віж улюбёны ў «чары» малых гарадкоў. І небеспадстаўна, бо ў беларускіх мястэчках, відаць, найбольш захавалася наша нацыянальная адметнасць, скажам так, беларускасць. Традыцыйная шчырасць і сумленнасць, адкрытасць народнага жыцця, унікальная старадаўняя архітэктура, ладная, да драбніц прадуманая плaніроўка паселішчаў, своеасаблівы мікраклімат.

Даўніна, асабліва ў нас, заўсёды лічылася нечым рэакцыйным, амаль непрыстойным. Яе дазвалялася толькі ганіць і, барані божа, сказаць што-небудзь у яе абарону.

Ураз можна было займець ярлык ідэалізатара мінулага, а гэта быў самы вялікі смяротны грэх. Дык вось, па даўнейшых мерках, Мар'ян Віж і займаецца такой заганнай справай, як «ідэалізацыя даўніны». Ён з такой рамантычнай узнёсласцю, з такім чыстым замілаваннем да аб'екта сваіх даследаванняў углядаецца ў кожную мястэчковую мураванку, у кожны каменьчык брукаванай вуліцы, услухоўваецца на гарадской плошчы ў гул натоўпу, віраванне і гамонку людзей, якія насялялі гэтую зямлю да нас, што міжволі і ты сам паддаешся магіі «чараў» аўтара і дыхаеш на поўныя грудзі паветрам мінуўшчыны, пераплятаеш яе з рэальнасцю дня сённяшняга і бачыш, што без таго, даўнейшага, не было б сённяшняга. І пачынаеш разумець, што мінулае нам патрэбна, каб захаваць сябе, каб вопыт пакаленняў дапамагаў нам быць больш разважлівымі і мудрымі, каб было што і нам пакінуць наступным пакаленням.

**В. КРАСЛАЎСКІ.**

## *МІНСКІЯ ШКОЛЬНІКІ Ў ДАНІІ*

# ПАМІЖ ДЗВЮМА ЗІМАМІ

**Прыкладна год таму назад гасцямі мінскіх школьнікаў былі іх аднагодкі з Даніі. Ад'язджаючы дадому, яны запрасілі да сябе беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Візіт у адказ адбыўся сёлета ў канцы ліпеня — жніўні. Сярод членаў савецкай групы была і аўтар гэтых радкоў, вучаніца 11-га класа 64-й мінскай школы Вольга Бабак. З дзіцячай непасрэднасцю і дарослай назіральнасцю яна расказвае пра свае ўражанні ад паездкі.**



— Ведаеце, там чалавек з чырвоным флагам стаіць: можа за намі?— узбуджана сказалі некалькі чалавек, пасланых «на разведку», далучаючыся да нашай крыху разгубленай у мітусні дацкага аэрапорта групы. Аказалася — сапраўды, чакалі нас. Пасля таго, як усе паселі ў аўтобус, адзін з сустракаўшых сказаў: «Добры дзень. Мяне завуць Йон, я прадстаўнік школы, у якой вы будзеце жыць. Яна знаходзіцца ў горадзе Госкільдэ (за 30 кіламетраў адсюль), цяпер мы туды паедзем. Вы будзеце жыць па 4 чалавекі ў пакоі. Астатняе вам раскажуць на месцы». У канцы пажартаваў: «У нас увесь ліпень стаяла цудоўнае надвор'е, і раптам у канцы паліло як з вядра. Гавораць, што рускія прывезлі з сабой дождж».

Вось так: крыху больш за дзве гадзіны пералёту, кароткае прывітанне — і мы ўжо сядзім ва ўтульным аўтобусе, глядзім на акуратныя домікі пад чарапічнымі дахамі, якія праплываюць за акном. І ўжо не верыцца, што трэба было столькі рыхтавацца і ў турбюро «Спутник», і дома, а потым цэлы дзень чакаць у Маскве самалёт, каб так хутка і проста ўвайсці ў зусім новае, незнаёмае жыццё чужой краіны.

Трэба сказаць, што ўключыліся мы ў яго вельмі хутка. Калі наступным днём пасля выхадных у школу прыехалі дацкія студэнты (так называюць у іх старшакласнікаў), жыццё закіпела. Жнівень — пачатак навучальнага года, то ўжо на наступны дзень пачаліся ўрокі, заняткі спортам і ўсё астатняе. Лёгкімі абавязкі ніяк не назавеш — справа ў тым, што ў такіх школах, як гэтая, студэнты жывуць увесь тыдзень. Толькі на выхадныя раз'язджаюцца па дамах. За парадкам сочаць самі. А гэта значыць, што і посуд мыюць, і пакоі, і лесвіцы прыбіраюць штодзённа, нават вокны ў сталовай чысцяць па некалькі разоў на тыдзень.

Нам адразу ж аб'явілі, што з гэтага часу мы — паўнапраўныя студэнты і абавязаны рабіць тое ж, што і датчане. І, шчыра кажучы, для нас гэта, асабліва спачатку, было цяжка. Тут адыграла ролю многае: і нязвыкла строгі рэжым дня, і даволі смешныя сітуацыі, калі, напрыклад, датчанам давялося нам тлумачыць, што такое апарат для мыцця посуду, і жаданне больш убачыць у Даніі, у той час як школьныя абавязкі займалі шмат часу. Але і гэта было карысным урокам для нас: мы самі пераканаліся, наколькі больш незалежныя і лепш падрыхтаваныя да самастойнага жыцця дацкія равеснікі.

Добрая магчымасць бліжэй пазнаёміцца з іх бытам з'явілася ў нас, калі мы на два дні раз'ехаліся па дамах студэнтаў — у госці. Я трапіла ў сям'ю «сярэдняга ўзроўню», як яны мне самі сказалі. У доўгім цагляным доме жывуць дзве сям'і. Тая, у якой я гасціла (бацька, маці, Марыя-студэнтка і яе малодшая сястра), і яшчэ адна сям'я. І хоць кватэра ў іх вялікая, ніякіх празмернасцяў я там не ўбачыла. Мне вельмі прыемна ўспамінаць нашы адносіны. Натуральны спачатку халадок вельмі хутка прайшоў, і, нягледзячы на цяжкасці, мы хутка знайшлі агульную мову. Мяне крыху азадачыла іх просьба «расказаць аб сваёй краіне ўсё, што я хачу». Але пасля некалькіх пытанняў высветлілася, што іх цікавяць самыя распаўсюджаныя тэмы: пасля расказаў аб вучобе, школе перайшлі да пытанняў пра Гарбачова, потым пра сталінскія часы і г. д. На жаль, сказалі мае слухачы, усё, што яны чулі раней пра нашу краіну, было толькі адмоўным. І тым не менш ніякай прадузятасці супраць сябе як прадстаўніка «рускіх» я не адчула. Іх вельмі зацікавіла наша мова. Яны нават склалі маленькі дацка-рускі слоўнік, спрабавалі тое-сёе вывучыць.

Часта мы самі не заўважаем, што звыклыя для нас словы гучаць вельмі смешна для іншаземцаў. Напрыклад, яны доўга не маглі растлумачыць, за кім ганяецца іх сабака па садзе, пакуль не здагадаліся намаляваць калючага зверка. «А, вожык!»— сказала я. Гэтае слова іх так развесяліла, што яны некалькі разоў прасілі паўтарыць яго, пакуль не вывучылі.

Вельмі спадабалася, што многа часу сям'я праводзіць разам. У тры гадзіны ўсе, як правіла, дома і да вечара могуць праседзець за сталом спачатку за кубачкам кавы, потым размаўляючы, калі маці што-небудзь вяжа, а бацька курыць люльку. І нягледзячы на тое, што я была сярод незнаёмых людзей, на мяне павявала нечым хатнім і спакойным.

Але, як аказалася пазней, некаторыя члены нашай групы трапілі ў сем'і з больш нізкім узроўнем жыцця, так што можна лічыць, мне пашанцавала.

— Дзе вы вучыцеся? Чым адрозніваецца лад жыцця датчан ад ладу жыцця рускіх? Вашы адносіны да Гарбачова і яго палітыкі?

Гэтымі і мноствам іншых пытанняў нас засыпала карэспандэнт адной з цэнтральных газет горада Госкільдэ. Калі мы давалі гэта, як нам здалося, кароткае інтэрв'ю і фатаграфаваліся, то нават і не думалі, што ўжо на наступны дзень і артыкул, і фатаграфія з'явяцца ў газеце.

І мне, і думаю, тром іншым удзельнікам інтэрв'ю было прыемна не толькі тое, што менавіта нас убачаць тысячы людзей, але і тое, што ўвогуле мы, савецкія, выклікалі цікавасць у датчан.

Данія, Капенгаген... Цяпер я ўспамінаю, наколькі далёкімі і нейкімі нерэальнымі яны здаваліся да паездкі; нават не верылася, што ўсё гэта я ўбачу на свае вочы.

— Куды заўтра плануецца? Капенгаген — дык Капенгаген.

Там мы пабывалі два разы. Гэта, вядома, мала, але ўсё ж твар гэтага цудоўнага горада ўбачылі. Шырокія плошчы, вузкія чыстыя вуліцы, своеасаблівая архітэктура, у якой новае спалучаецца са старым: напрыклад, бачыш, што будынак толькі што ўзведзены, а стыль той жа: пакаты чарапічны дах, чырвоная цэгла, невялікія вокны. Усё гаворыць аб беражлівых адносінах датчан да сваёй культуры.

За некалькі дзён да ад'езду мы павінны былі сустрэцца з мэрам Госкільдэ. Калі шчыра, то мне больш цікава было паглядзець, дзе знаходзіцца мэрыя, што гэта такое ўвогуле, чым сама сустрэча. Мэрыя аказалася на самай справе вельмі цікавай: як быццам памылкова ў старадаўні замак трапілі мікрафоны і электрычныя лямпы. І сам рухавы, вясёлы, з сівой бародкай мэр адразу ўсім спадабаўся. Яму задавалі многа пытанняў, нават спыталіся, як дабіраецца на работу, і калі ён сказаў, што на веласіпедзе, усе сімпатыі былі на яго баку.

Такім жа сімпатычным, як і мэр, здаўся нам фермер, да якога мы ездзілі ў госці. Усюды чыста, суха, прыгожа. У кароўніку дзеля цікавасці паглядзелі на шыльдачку, дзе напісаны самы вялікі ўдой: 31 літр за адзін раз. Рассмяшыў нас маленькі музей старых прыладаў. Там мы ўбачылі звычайныя калёсы, плуг, якімі ў нас яшчэ часта карыстаюцца сяляне.

Вялікі белы дом з чарапічным дахам увесь акружаны зелянінай. У двары невялікі басейн, каля якога вельмі прыемна пасядзець у гарачы дзень. Як нам сказаў фермер, побач з яго гаспадаркай знаходзіцца яшчэ некалькі такіх жа — яго бацькі і сыноў.

Вядома, для 10 дзён знаходжання ў Даніі экскурсій у нас было нямнога. Бадай, найбольш цікавым, акрамя Капенгагена, быў візіт у замак Кронборг (Эльсінор). Менавіта туды Шэкспір пасяліў свайго Гамлета, і не дарэмна. Хоць усё гэта і было прыдумана аўтарам, але «дух часу» адчуваецца там і цяпер: змрочная абстаноўка, старыя габелены і карціны на сценах, мармуровыя каміны, крутыя лесвіцы — словам, сапраўдная крэпасць.

У той жа дзень у нас адбылася адна нечаканая сустрэча: вяртаючыся на стаянку пасля Эльсінора, мы раптам убачылі знаёмыя абрысы савецкага аўтобуса. І нумар маскоўскі, і на шкле наклеена афіша: «Караван міру». Унутры людзей не аказалася, а не ўбачыўшы нікога, ехаць было крыўдна, і мы пакінулі ў кабіне вадзіцеля паперку з надпісам: «Прывітанне з Беларусі». Мы яшчэ не паспелі ад'ехаць, як яны вярнуліся ў аўтобус,не як здагадаліся, хто напісаў. Напамахалі нам праз акно. Нават не чакала, што так прыемна будзе сустрэць за мяжой сваіх суайчыннікаў.

Калі давялося ад'язджаць, высветлілася, што, нягледзячы на стрыманасць, мы з датчанамі паспелі прывыкнуць адзін да аднаго, з многімі пасябравалі. І не толькі са студэнтамі, але і з настаўнікамі. Гэтыя людзі не грэбуюць ніякай работай, вельмі многае ўмеюць: разам са студэнтамі займаюцца спортам, вядуць урокі, фатаграфуюць, амаль усе па чарзе вадзілі наш экскурсійны аўтобус.

Калі за дзень да нашага ад'езду студэнты раз'ехаліся на выхадныя, менавіта настаўнікі праводзілі нас. Развітваючыся, яны паабяцалі зімой прыехаць разам з вучнямі да нас у Мінск.

І нам успомнілася мінулая зіма, калі такія ж студэнты-датчане гасцілі ў нашым горадзе, знаёміліся са школьным жыццём, разам з намі гулялі па Мінску. З імі мы зблізіліся вельмі хутка, і вялікая заслуга ў гэтым належыць кіраўніку нашага школьнага Клуба інтэрнацыянальнай дружбы, настаўніцы англійскай мовы Людміле Дзмітрыеўне Бойка, якая была з намі і ў Даніі. Мы вельмі шкадавалі, што не трапілі там да нашых старых знаёмых.

Але затое ў нас з'явіліся новыя сябры ў Даніі, і гэтыя кантакты, я спадзяюся, будуць працягвацца.

**Вольга БАБАК.**

# No perder la oportunidad

## BIELORRUSIA: DIRECCIONES DEL DESARROLLO

**Hasta hoy día, en distintas partes del país los dirigentes con ideas anticuadas aconsejan a sus subordinados: "No se apresuren a introducir reformas... Mejor vayan a Bielorrusia y vean cómo allí está todo en orden y qué vida tan buena tienen. Sigan su ejemplo". Y, sucede, que estos consejos son tenidos en cuenta.**

**La gente va a Bielorrusia con la esperanza de hallar allí la tierra prometida, única, donde se puede llevar una vida tranquila y acomodada (aunque en forma relativa) y, al mismo tiempo, sin "traicionar los principios", ni "darle rienda suelta al pueblo". En la experiencia bielorrusa buscan las pruebas de que se podría evitar la mayoría de los problemas que inundaron el país: sólo había que seguir estrictamente las recetas del "socialismo desarrollado" prescritas aún en la época del estancamiento...**

Mejor que todo comprendemos hoy día el lenguaje del mostrador. Cuando la gente llega a Bielorrusia, ve el contraste entre la desastrosa situación por la que atraviesa el país, en general, y lo que hay en nuestra república. En muchos sentidos el mostrador bielorruso es más rico que el moscovita. Es más rico en productos alimenticios y mercancías industriales. La gente lleva de aquí muebles, vajilla, artículos de punto.

Me permito la libertad de no citar cifras. Los que deseen pueden cerciorarse ellos mismos, consultando las guías de estadística, que los índices económicos de Bielorrusia figuran entre los mejores en el país.

Bielorrusia es mi patria, no tengo otro lugar que sea más querido para mí. Aquí vive gente muy bondadosa y talentosa. Son personas crédulas y obedientes, a quienes es difícil imaginarlas declaradas en huelga, quienes no cruzan el camino con la *luz* roja, incluso si no hay un solo auto cerca.

Presicamente estos rasgos nacionales —aunque no sólo ellos—, contribuyeron a la formación de un sistema de dirección especial. En otras palabras, se trata del sistema administrativo de ordeno y mando, tan conocido para nosotros, pero en su variante ejemplar, la cual ha alcanzado el apogeo de sus posibilidades. El mismo se basa en una férrea disciplina administrativa, la estricta subordinación de las capas inferiores a las superiores, la obediencia de las autoridades republicanas a las del país.

Cabe agregar que en este aspecto hay cierta influencia de carácter histórico. Sea como fuere, los períodos de la historia moderna, que provoca en los bielorrusos un sentimiento de orgullo nacional —el auge del movimiento guerrillero durante la guerra y el período del rápido resurgimiento de postguerra— están vinculados a este mismo sistema.

Es posible que los habitantes de la república, en su gran mayoría, hasta ahora seguirían resignándose con tal sistema (o haciendo caso omiso de éste), si no fuera por dos acontecimientos. Estos últimos evidenciaron claramente las propiedades más peligrosas del sistema administrativo de ordeno y mando: el menosprecio de las necesidades del pueblo, sobre todo cuando se trataba de aquellas que no encajaban en los marcos de la rendición de cuentas planeada.

Cada uno de estos acontecimientos arrastró consigo la tragedia. El primero es Chernóbil. El engaño al pueblo en cuanto a las áreas o niveles de contaminación, la falta, en muchos lugares, de productos "limpios", de medicamentos elementales, las incesantes demoras en el traslado de la gente de aquellos lugares donde era imposible vivir...

El segundo acontecimiento es el del 30 de octubre de 1988. La violenta disolución de la manifestación pacífica dedicada a la memoria de las víctimas de las represiones estalinistas. Ahora, pasado cierto tiempo, pienso que si en aquel entonces se hubiera dado una valoración de principio a lo sucedido en Minsk, quizás no habría ocurrido la tragedia de Tbilisi el 9 de abril de 1989. Es probable, que precisamente el día 30 de octubre haj que considerarlo el inicio de aquella etapa común para todo el país, en la que el auge de la actividad social de la gente tropezó con la reacción de las fuerzas, a las cuales dicho auge les disgustaba.

Ambos acontecimientos revelaron lo siguiente: muchos de los dirigentes en la república no saben, tienen miedo de llevar a cabo un diálogo abierto con el pueblo, intervienen poco en la prensa, por la TV, en los mítines. Esta falta de hábitos, la confusión se han revelado recientemente en la intervención del dirigente del PC de Bielorrusia en el Soviet Supremo de la URSS.

La cultura política del pueblo sigue creciendo, al igual que crece el prestigio del Frente Popular de Bielorrusia. Entre los demás frentes populares republicanos éste se destaca por su ecuanimidad y sensatez de acciones.

En busca de explicaciones a hecho caso omiso de la opinión pública bielorrusa.

Ahora bien. ¿Quizás no valga la pena rechazar por completo el sistema administrativo de ordeno y mando, el cual ha asegurado en la república un relativo bienestar material?

Primero, precisamente relativo. Aquí no se trata de ninguna aproximación al nivel de los países desarrollados.

Segundo, la astucia del sistema administrativo radica en que finge ir resolviendo problemas durante un lapso limitado. Y los bienestares conocen perfectamente muchos ejemplos de ello. Por ejemplo, el drenaje de los pantanos en las regiones occidentales de la república. Al principio se produjo un brusco aumento de las cosechas. ¿Y después? Después la capa fértil de los suelos resultó devastada por el viento; la tierra bielorrusa fue a parar incluso a Italia. Otro ejemplo: los actuales éxitos de la cría de cerdos en la república a base de grandes combinados. Pero, ¿qué nos espera en el futuro? Los combinados de carne y productos porcinos se construyeron sin tanques de sedimentación, plantas de tratamiento, por lo cual grandes volúmenes de aguas negras se evacúan a los campos y a los ríos, contaminando el agua. ¿Y qué ocurre mañana?

Tercero, ya se avizaron los primeros indicios de futuros y graves problemas. Uno de ellos es la crisis del sistema de la educación escolar y de su base material. Hasta el sexto o séptimo grado los escolares estudian en dos turnos. Hay de 40 a 45 alumnos por clase. Se va a pique el prestigio de la profesión del magisterio, que antes era muy alto en Bielorrusia.

Bielorrusia ha tenido suerte, se le ha dabo una oportunidad histórica. La perestroika se inició cuanod esta república aún no había entrado en el período del descenso económico, que agudizó la situación en otras repúblicas federadas. Pero, si nos demoramos con el rechazo al sistema administrativo de ordeno y mando carente de toda perspectiva, tal descenso será inevitable. Sería mejor iniciar las transformaciones partiendo de una situación más favorable. Por ahora, esto aún es posible.

este interesante fenómeno hay que referirse al problema étnico en Bielorrusia. La situación en esta esfera es bastante ambigua.

Por un lado, para Bielorrusia el problema nacional no figura en primer plano. Las cuestiones políticas y ecológicas son mucho más agudas.

Pero, por otro lado, ello no significa en absoluto que el problema nacional está resuelto por completo. Al revés, la situación en la república ha alcanzado tal grado que el pueblo está a punto de perder su autoconciencia nacional. Muchos bielorrusos consideran sinceramente que su primer idioma es el ruso, mientras que el bielorruso es el segundo. Quiero confesar aquí que en mi caso particular, siendo de nacionalidad bielorrusa y dominando perfectamente el idioma bielorruso, de todos modos pienso en lengua rusa.

En resumidas cuentas, el problema interétnico crea una base muy seria para los conflictos en un futuro ya próximo. Claro, siempre y cuando el movimiento nacional no se mantenga en el cauce de la cultura política. Y para ello es necesario el diálogo entre la dirigencia de la república y el Frente Popular.

Entre tanto, los escalones superiores del poder no se muestran demasiado dispuestos a llevar a cabo tal diálogo. Un ejemplo evidente de ello resultó la llamada "autogestión financiera bielorrusa". La discusión de los caminos del paso a la autogestión financiera podría convertirse en tema de una discusión seria y constructiva en la república, en una tarea que pudiera unir a las fuerzas más diversas. Pero, otra vez, los burócratas locales y de Moscú han

**Alexandr ZHURAVLIOV,**
**diputado del pueblo de la URSS**



*Comidas gratuitas han comenzado a ofrecerse a los ancianos sin familia de Minsk. El departamento de seguridad social y el Fondo regional de Caridad organizaron en treinta comedores de la capital de Bielorrusia la alimentación de ancianos cuya pensión es inferior al mínimun de vida. En el futuro próximo se prevé suministrar comidas calientes gratuitas a los habitantes de la ciudad que por su estado de salud no pueden salir de la casa.*

*Servicios análogos han recibido los ancianos sin familia de Slutsk, próximamente recibirá comidas sin cargo la gente de avanzada edad de Borisov y Volozhin.*

*En el comedor № 74 de Minsk la cocinera F. GORNOVA prepara la comida para los ancianos.*

*Foto: Yu. PAVLOV*

# UNA MIRADA DESDE EL COSMOS

**Adjunto a la Uuiversidad Estatal de Bielorrusia se ha constituido el centro científico republicano de diagnosis aerocósmica de los recursos naturales de la Tierra.**

Para poder recibir desde el espacio información detallada relacionada con la agricultura, los bosques, las aguas y la ecología de la Tierra, se tuvo que idear equipos más sensibles, nuevos en principio. Con este fin, los científicos bielorrusos recurrieron a métodos de investigación espectral, los que ofrecen bastantes ventajas, ya que los aparatos espectrales posibilitan un juicio exacto del estado del objetivo observado, gracias a lo cual se ve bastante engrosada también la lista de descubrimientos astronómicos.

En el Instituto de Física de la AC de la RSSB, un grupo de especialistas encabezados por el académico Leonid Kiselevsky, se dedicó a aplicar la espectrometría a una rama nueva de investigaciones. Su labor posibilitó la creación del sistema microprocesador espectrométrico aviacósmico SKIF-M, que fue probado varias veces, granjeándose elogios tanto de los cosmonautas soviéticos como de los especialistas norteamericanos, durante el experimento conjunto que se llevó a cabo en el polígono aviacósmico soviético en el verano de 1988. Más tarde se incorporó a esta labor el Instituto de Investigación Científica de Problemas de Física Aplicada, de la Universidad bielorrusa, con cuya participación fueron confeccionados atlas únicos en su género, verificando los cuales se puede juzgar del estado de objetivos terrestres.

El nuevo centro científico ya hoy está en condiciones de determinar de manera fidedigna la biomasa de los objetivos vegetales, de detectar las desviaciones de su estado sanitario en etapas tempranas, de pronosticar las cosechas, de determinar el origen de las arenas (cosa importante para los geólogos), de utilizar las plantas como indicadores del contenido de tal o cual componente en el suelo, de constatar el exceso o la falta de humedad en el suelo y el grado de su salinización, y de determinar ya en la etapa inicial las enfermedades de los cereales, la patata, etc.

—El programa tecnocientífico de observación espectral del medio ambiente, adoptado no hace mucho a nivel de la república, tiene por objeto satisfacer las demandas de ramas concretas de la economía nacional —cuenta Leonid Kiselevsky—. Creemos que su efecto económico va a sumar varios millones de rublos anuales. Es importante recalcar que los nuevos métodos de observación permiten detectar el efecto nocivo de las empresas industriales en el medio ambiente, sin lo cual el desarrollo de la economía nacional resulta ya inconcebible.

Se planifica agregarle al nuevo centro varios laboratorios de investigación científica, dos cátedras y un sector de diseño. La Universidad formará el personal necesario para ellos. En un futuro próximo se va a crear un potente centro de cómputo y una central de comunicación con satélites espaciales.

**Vladímir BIBIKOV**

**Redactor de la "Página en español": Demetrio OKULIK**

✦ АМАЛЬ ДВА МЕСЯЦЫ ГАСЦЯВАЎ У БЕЛАРУСІ НАШ ЗЯМЛЯК З ЗША ДАНЧЫК ✦ ПЕСНЯ ПРЫНЕСЛА ЯМУ ВЯДОМАСЦЬ ✦ КОЖНЫ ДЗЕНЬ КАНЦЭРТ І АНШЛАГ

# Я АДНОЙ ТАБЕ НАЛЕЖУ, БЕЛАРУСЬ МАЯ

АМАЛЬ што два месяцы гасцяваў у нас мала каму вядомы клерк са Злучаных Штатаў Амерыкі Багдан Андрусішын — Данчык. Але за час знаходжання на зямлі продкаў гэты малады чалавек, можна сказаць, заваяваў Беларусь і сэрцы беларусаў.

Бадай што, няма ў рэспубліцы такой газеты, якая б так ці інакш не адгукнулася на канцэрты Данчыка. Хаця канцэртамі тыя сустрэчы, у час якіх ён і спяваў, і чытаў вершы, і вёў жывую гутарку з залай, можна назваць вельмі ўмоўна. Беларус з-за акіяна стаў у нас сёлетняй восенню адной з самых папулярных асоб: дзесяткі журналістаў, спаборнічаючы ў спрыце, бралі ў спевака інтэрв'ю, студэнты інстытутаў, мастакі, выкладчыкі, ды і наогул далёкія ад мастацтва людзі імкнуліся трапіць на яго канцэрты. І хаця Данчык выступаў амаль што кожны дзень усюды, куды яго запрашалі, набыць білет было не так ужо і проста. Ну а сустрэцца і пагаварыць, натуральна, яшчэ больш складана.

Мне пашанцавала ўзяць у Данчыка інтэрв'ю амаль што ў першыя дні яго знаходжання ў Мінску. Спявак, заслужаны артыст рэспублікі Лявон Барткевіч, па запрашэнню якога і прыехаў гэты сябар з Амерыкі, наладзіў нам сустрэчу ў сваёй кватэры.

Я нічога не запісвала ні на дыктафон, ні ў блакнот. Проста мы сядзелі за сталом, пілі каву, гаварылі пра ўсё на свеце: Данчык пра тое, як ён вучыўся на журналіста, як купіў сабе некалі гітару і стаў вучыцца на ёй іграць, як сустрэўся і пазнаёміўся ў Нью-Йорку з Лявонам Барткевічам і з «Песнярамі», якія больш чым дзесяць гадоў назад былі ў Штатах на гастролях, як доўга чакаў сустрэчы з Беларуссю.

Я слухала Данчыка і яго маці Юлію, якія, адчувалася, былі моцна ўзрушаны тым, што іх тут так цёпла сустрэлі. З цікавасцю ўглядалася ў прыгожы, трохі бледнаваты твар юнака. (У дарозе прастудзіўся, і цяпер яго адпойвалі тут зёлкамі). Дык вось ён які, нашчадак сям'і вядомых дзеячаў беларускай культуры Луцкевічаў... Тонкія, пяшчотныя па-юнацку рысы. Загадкавая і абаяльная (прабач мне, чытач, банальныя словы) усмешка. І многа, мнагавата для 30-гадовага чалавека сівізны ў чорных валасах. Ён бясконца курыць, выпускаючы пад столь, як быццам забаўляецца, колцы дыму. У нервовых пальцах злёгку дрыжыць цыгарэта. Льецца амаль пазбаўленая акцэнту беларуская мова.

Маё вуха прафесіянала, які даўно працуе ў газеце і карыстаецца сучаснай літаратурнай мовай, адзначае ў гэтай мяккай гаворцы старадаўняе «Менск», «спадарыня», «бабця», «ангельская мова», «Наваградак»...

Субяседнік даверліва і разам з тым, як здаецца, насцярожана пазірае на мяне, прадстаўніка газеты, да якой яшчэ з былых часоў захаваўся недавер у асяроддзі пэўных колаў беларускай эміграцыі ў Амерыцы. Пра гэта, прынамсі, мне сказала сёлета ў Беластоку на фестывалі беларускай культуры кіраўніца танцавальнага гуртка «Васілёк», наша зямлячка, прафесар хіміі з Нью-Йоркскага універсітэта Ала Орса-Рамана.

Нібы ўгадаўшы мае думкі, загаварыла маці Данчыка спадарыня Юлія.

— А вам прывітанне ад Алы Рамана. Яна казала нам пра беластоцкія сустрэчы. Мы з цікавасцю прачыталі тыя артыкулы, якія вы надрукавалі ў "Голасе Радзімы" пра «Васілёк». Якраз перад ад'ездам сюды... Ала прасіла мяне перадаць вам сувенір на памятку.

Жанчына знікла на хвіліну з-за стала, прынесла з суседняга пакоя нешта ў бліскучай паперы. Яе сын дастаў з пакеціка тоненькі, модны цяпер бранзалецік. Я замахала рукамі, маўляў, нашто гэта, не вазьму.

— Не крыўдзіце нас, Таня. Ад чыстай душы прэзент.

Я прасунула руку ў бранзалецік, ён бразнуў аб мой, сярэбраны, зроблены старым майстрам па ўзору адкапанага археолагамі на старым гарадзішчы жаночага ўпрыгажэння XVI стагоддзя...

...Гэтак добра запомніўся і цяпер прыгадваецца ў дэталях той першы дзень нашага знаёмства. Ішоў дождж. Лявон прапанаваў праехацца на аўтамабілі па Мінску, бо госці зусім яшчэ не бачылі горада.

Данчык прыляпіўся да акна, моўчкі праводзячы поглядам прахожых на праспекце, супермодных хлопцаў і дзяўчат, якія ў абдымку шпацыравалі па вуліцы, незважаючы на надвор'е.

Лявон уключыў магнітафон. І ў машыне загучаў голас Данчыка. Ён спявае «Аксамітны вечар». Песня гэта, напісаная нашым наваполацкім паэтам і бардам Сяргеем Сокалавым-Воюшам і выкананая Данчыкам, імгненна стала вельмі папулярнай у асяроддзі беларускай эміграцыі, а таксама і ў нас. Данчык сапраўды выконвае песню так, што нават самая халодная і ачарсцвелая душа адагрэецца, а ў самага стрыманага чалавека вочы стануць мокрымі.

**Стан дзявочы Белай Вежы,
Подых ручая...
Я адной табе належу,
Беларусь мая...**

Словы гучалі як малітва, як прызнанне ў вечнай, бязмежнай любові і адданасці таму краю, у якім ён ні разу дагэтуль не быў, таму народу, часцінкай якога з'яўляецца і часцінкай якога сябе адчувае.

Мы выйшлі ля ГУМа. Данчык прыдзірліва, як нейкі інспектар, агледзеў шыльды на ўстановах і магазінах. Я перахапіла яго позірк і зразумела, што прыцягнула ўвагу нашага госця: некаторыя шыльды былі напісаны па-руску. Ён выразна глянуў на мяне, маўляў, праўду казалі, што ў Беларусі Беларуссю не пахне.

— Гэта яшчэ што, — падкалола я яго, спрабуючы разварушыць, разгаварыць, — у нас не надта многа беларусаў гаворыць на сваёй мове, усё больш, як ты кажаш, — «па-расейску». Хіба што інтэлігенцыя, моладзь. Адраджэнне толькі пачынаецца...

Данчык маўчаў, нібы вырашыў не ўступаць тут ні ў якія спрэчкі. Пэўна, падумала я, далікатнасць і выхаванасць не дазваляюць госцю нешта крытыкаваць або казаць кепскае. А можа, хоча сам ва ўсім разабрацца спачатку, паездзіць, паглядзець, супаставіць свае назіранні з тым, што ведаў пра Беларусь з кніг і расказаў тых, хто, пабываўшы ў родных мясцінах, застаўся моцна расчараваным.

Пасля пайшлі на агледзіны ГУМа. Спадарыня Юля, як спрактыкаваная гаспадыня, прыглядалася да кошту тавараў, брала ў рукі абутак, посуд, мацала спаднічкі. Мы прабіваліся праз чэргі, што стаялі за дэфіцытамі. Узмакрэлыя, ледзь не згубіўшы адзін аднаго, з палёгкай выбраліся з натоўпу. «Знайшлі месца, куды вадзіць гасцей», — падумалася. У іх там супермаркеты, тавару ўсякага, на любы густ...

Ужо ў машыне, як ехалі назад, да Лёні, Данчык нарэшце загаварыў: «Але ж у ватоўках і з латкамі тут ніхто не ходзіць, усе апрануты прыстойна...»

— У ватоўках, мілы Данчык, яшчэ ходзяць старыя ў вёсцы, — зусім збіў з панталыку «амерыканца» Сяргей Сокалаў-Воюш, які быў з намі ў паездцы. — Цяпер не прынята замежным гасцям «вочы замазваць». Няхай ведаюць усе нашыя вартасці і недахопы. Магу падарыць экземпляр, каб меў уяўленне. Непрыгожа, але цёпла.

Потым я яшчэ неадночы сустракалася з Данчыкам. Была на яго канцэртах у Палацы прафсаюзаў, у Доме літаратара, ва універсітэце. Бачыла трыумф. Бачыла, які ён шчаслівы. Бачыла, што стомлены і ледзь трымаецца на нагах, выматаны бясконцымі паездкамі і тым багемным ладам жыцця, які ўсталяваўся з прыездам гасцей з кватэры Лявона Барткевіча і Вольгі Корбут. Аднак, не зважаючы ні на што, ён працягваў



падарожнічаць па Беларусі — разам з маці і сябрамі пабываў ў Гродне, Віцебску, Полацку і Наваполацку, наладжвалі і там імправізаваныя сустрэчы з мясцовымі жыхарамі. Ужо перад ад'ездам, перапоўнены пачуццямі ад усяго ўбачанага, Данчык дзяліўся сваімі ўражаннямі, назіраннямі і думкамі.

Заставалася толькі сесці і напісаць артыкул, бо матэрыялу было — мора. Але, як заўсёды гэта бывае, жыццё ў самы нечаканы момант выбіла з каляіны. Я трапіла ў бальніцу. І надоўга. Узяла з сабой запісы канцэртаў Данчыка. І вечарам, калі былі скончаны працэдуры, нацягвала навушнікі і слухала, як спявае, як размаўляе з аўдыторыяй, як авалодвае ёю гэты непрафесійны, па сутнасці, але тым не менш вельмі высокай культуры спявак. Я слухала яго песні, яго чысты, як гаючая крыніца, голас і лячылася гэтай чысцінёй і шчырасцю, гэтым ачышчальным болем за лёс сваёй Радзімы. Ён спяваў і па-французску, і па-англійску, і па-іспанску, і па-ўкраінску цудоўна. Але больш за ўсё мяне кранала песня на словы паэта Сяргея Новіка-Пяюна «Зорачкі». (Данчык пабываў тут у яго ў гасцях).

**Шмат гадоў тут на выгнанні,
У чужыне
Трэба мучыцца душою,
Сэрцам мне.
Навакол нідзе не ўгледзіш родных хат,
Не працягне рук зычліва
Родны брат.
Не падзеліш нават думак —
З некім тут.
Не прыгорне ў адзіноцтве
Родны кут...**

Якраз гэта песня, якую пастаянна выконвае ў канцэртах і запісаў на «кружэлку» (пласцінку) Данчык, як нельга лепш характарызуе духоўны стан беларускага, ды і не толькі беларускага, відаць, эмігранта, які жыве ўдалечыні ад Радзімы, ад свайго народа. Немаведама, як адчуў гэта Данчык, бо ён жа нарадзіўся ў Амерыцы.

Мяркуючы па яго ж расказах, жыццё іх сям'і складвалася зусім някепска ў гэтай краіне. Жывуць у цэнтры Нью-Йорка, брат — адвакат. Маюць загарадны дом.

Магчыма, ён мог стаць добрым журналістам, каб пайшоў працаваць па спецыяльнасці. Тым больш, што прафесія гэта даволі прэстыжная ў Штатах. Але... «Я заўсёды марыў быць артыстам, нават займаўся ў студыі, — сказаў на адной з сустрэч у Мінску Данчык. — А спяваць—то я спяваў заўсёды. Я належаў да ўкраінскіх скаўтаў, і вельмі прыгожыя былі традыцыі, калі ля вогнішча спяваюць з гітарай, мне гэта вельмі падабалася». Можа быць, якраз ля вогнішча, слухаючы казку-мару пра папараць-кветку, адчуў юнак сваю духоўную сувязь з продкамі, пачаў спяваць беларускія песні.

У 1974 годзе беларуская моладзь у ЗША арганізавала паказ талентаў, і Данчык тады першы раз выступіў публічна, атрымаў прэмію. У 19 гадоў запісаў першую сваю пласцінку. З уласцівай яму сціпласцю і надзвычайнай патрабавальнасцю да сябе Данчык ацэньвае сваю першую «кружэлку». "Яна зусім аматарская, гітара не настроена, голас не развіты».

Маючы незадавальненне сваімі вакальнымі магчымасцямі і жадаючы іх удасканальваць, юнак у час вучобы ва універсітэце пачынае браць урокі спеваў. За 40 мінут трэба было плаціць 50 долараў. Увогуле гэта не самы дарагі кошт урокаў. Але ж не вельмі па кішэні студэнту — усяго 7 — 8 урокаў ўдалося атрымаць. Словам, прыйшлося займацца самаадукацыяй. Але акалічнасці жыцця склаліся інакш. «Каб я толькі мог, я б выбраў кар'еру спевака», — вырвалася аднойчы ў яго.

Цяпер у Данчыка запісаны ўжо тры «кружэлкі». Апошняя — разам з Лёнем Барткевічам, калі той гасцяваў у яго летась у Нью-Йорку. Песні тут выкананы на вышэйшым прафесійным узроўні. Дарэчы, усе пласцінкі запісаны на добраахвотных ахвяраванні беларускіх эмігрантаў. Выканаўца даходаў не атрымлівае ніякіх. «Я раблю гэта на карысць беларускай справы, а не дзеля грошай», — адказваў Данчык на пытанні нашых журналістаў.

А грошы на жыццё ён атрымлівае за тое, што кожны дзень ходзіць на службу ў банк. «Увогуле мне мая праца падабаецца, — казаў Данчык і не без гумару дадаваў: — Гэта нешта накшталт вашага начальніка аддзела кадраў. У нас усе, хто мае добрую працу, трымаюцца за яе. Мой заробак 25 тысяч у год. То невялікія грошы, але паабяцалі ў далейшым больш».

Я яшчэ раз прыгадала ўсё, што расказваў мне сын Юліі Андрусішынай пра свой шлях да Беларусі. 12 гадоў ён марыў прыехаць сюды, але не атрымліваў дазволу ад нас. Сёлета дазвол быў атрыманы. Не адпускаў шэф. І тады тэлекс у Нью-Йоркскі банк з просьбай аб двухмесячным водпуску даў наш Цэнтральны Камітэт камсамола. Данчык ехаў сюды, нават не маючы пэўнай надзеі выступіць са сваімі песнямі. «Я не спадзяваўся, што мяне тут увогуле ведаюць, — казаў ён у час нашай апошняй сустрэчы. — Баяўся выйсці на сцэну. Але ж атрымалася ўсё зусім інакш. Я спяваў кожны дзень, гутарыў з тымі людзьмі, якія запрашалі мяне на сустрэчу, чытаў вершы, адказваў на пытанні. Я быў такі шчаслівы з вамі!»

Відаць, не памылюся, калі скажу, што кожны, хто меў такую сустрэчу з Данчыкам і слухаў яго песні пад акампанемент гітары, быў прыемна здзіўлены і зачараваны. Бо талент яго — ад бога. Нездарма на сустрэчы ў Доме літаратара паважаны наш пісьменнік, прафесар філалогіі Ніл Гілевіч, да глыбіні душы ўзрушаны, выйшаў на сцэну, абняў Данчыка і сказаў, што для славы Беларусі і тысячы выдатных трактараў не зробяць таго, што можа зрабіць адна цудоўная песня ў такім цудоўным выкананні.

Выручаныя ад канцэртаў сродкі Данчык перадаў у фонд пацярпеўшых ад чарнобыльскай аварыі, а таксама Таварыству беларускай мовы.

Ну а якой жа застанецца ў яго памяці Беларусь?

— Я столькі ўсяго ўбачыў, столькі меў сустрэч, што проста ў шоку, — казаў Данчык. — Мы ездзілі, дзе хацелі, і сустракаліся, з кім хацелі. Наведалі ўсіх сваякоў. Знайшлі тое месца, дзе да вайны жыла мая бабуля. Пагледзелі Маскву, Ленінград, Вільню, Кіеў, Львоў...

Я цяпер часта прыгадваю Данчыка. Разважаю над феноменам яго нечаканай, проста ашаламляючай папулярнасці ў Беларусі. Выдатны спявак? Так. Заслужаны поспех? Так. Наша гордасць? Так. Усё так. Але сумна ўсё ж такі, што тыя самыя гледачы, якія гэтак рваліся «на Данчыка з Амерыкі», зусім не рвуцца, скажам, на Пархоменку і Казака, выканаўцаў народных песень, якія, між іншым, заслужылі найвышэйшую пахвалу ў нашых суайчыннікаў у ЗША, калі сёлета выступалі ў Нью-Йорку і ў Полацаку (Кліўленд), на многіх і многіх артыстаў высокага класа, якімі можна ганарыцца па праву. Чаму гэтак атрымліваецца? Ці не ад пачуцця ўласнай нацыянальнай непаўнацэннасці? А можа, ад адсутнасці культуры і самапавагі?

Характэрна, мне здаецца, што Данчык, якому за час яго знаходжання ў Беларусі выпала пазнаёміцца з многімі таленавітымі артыстамі, паэтамі, кінематаграфістамі, мастакамі, убачыць лепшыя творы нашых дзеячаў культуры, сказаў: «Я ганаруся, што я беларус, і ганаруся вашай і маёй Беларуссю».

Таццяна АНТОНАВА.



## «МУЖЧЫНА ЧАСУ-89»

**Які ён, ідэал сучаснага мужчыны! Адказ на гэтае пытанне вырашылі пашукаць у Магілёве. Па ініцыятыве Ленінскага райкома камсамола горада і супрацоўнікаў Палаца культуры навукова-вытворчага аб'яднання шаўковых тканін была арганізавана шоу-праграма «Мужчына часу-89». Прэтэндэнты на такое ганаровае званне дэманстравалі сілу, спрыт, дасціпнасць, добрыя манеры. Пераможцам выйшаў студэнт другога курса Магілёўскага тэхналагічнага інстытута васемнаццацігадовы Андрэй Шарстнёў. Яму ж дастаўся і прыз сімпатый гледачоў.**

**НА ЗДЫМКУ: пераможца конкурсу Андрэй ШАРСТНЁЎ.**

**Фота С. ЖАЛУДОВІЧА.**

*У ВАШУ КАЛЕКЦЫЮ*

# ГЕРБ І ФЛАГ РЭСПУБЛІКІ НА МАРКАХ

У 1937—1938 гадах у нашай краіне ўпершыню была выпушчана серыя марак, на якіх былі адлюстраваны дзяржаўны герб СССР і гербы 11 саюзных рэспублік. На паштовым знаку цагляна-чырвонага колеру быў паказаны дзяржаўны герб БССР.

Гісторыя герба БССР пачалася ў далёкім 1919 годзе. У Канстытуцыі БССР, прынятай I з'ездам Саветаў БССР 3 лютага 1919 года, сказана, што герб БССР складаецца з адлюстравання на чырвоным фоне ў промнях сонца залатых сярпа і молата (арт. 31). Па Канстытуцыі, у рэдакцыі VIII Усебеларускага з'езда Саветаў, прынятай 11 красавіка 1927 года (арт. 74), герб БССР складаецца з сярпа і молата ў промнях сонца, акаймаваных вянком з жытніх каласоў, пераплеценых канюшынай, — злева ад гледача. Справа — з дубовай галінкі з жалудамі. Унізе паміж палавінкамі вянка — частка зямнога шара. Абедзьве палавінкі вянка перавіты чырвонай стужкай з надпісам: «Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся!»— злева на беларускай і яўрэйскай мовах, справа — на рускай і польскай. Унізе герба надпіс «БССР». Наверсе пяціканцовая зорка.

Менавіта гэты герб БССР варыянта 1927 года і паказаны ўпершыню на паштовым знаку ў 1938 годзе. Пры ўважлівым разглядзе маркі ўсе надпісы на малюнку можна прачытаць.

Значныя змены ў гербе БССР адбыліся ў 1938—1939 гадах. Змяніўся як рысунак герба, так і надпісы. У сувязі з прызнаннем першай сесіяй Вярхоўнага Савета БССР дзяржаўнымі мовамі Беларусі дзвюх моў — беларускай і рускай — было прапанавана змяніць надпісы на гербе — захаваць надпіс толькі на гэтых дзвюх мовах. Было таксама вырашана змяніць вянок у гербе — замяніць дубовую галінку жытнімі каласамі, пераплеценымі льном. 26 ліпеня 1938 года I сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла гэтыя прапановы і зацвердзіла закон аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі БССР адносна герба рэспублікі. Але новы герб праіснаваў нядоўга. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 20 лістапада 1938 года зноў быў зменены пераклад на беларускую мову надпісу «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Слова «яднайцеся» да гэтага Указа перакладалася «злучайцеся». У новым перакладзе яно перадавалася словам «яднайцеся». Гэты пераклад больш дакладна, правільна адлюстроўваў змест лозунга на беларускай мове.

Праз 10 гадоў пасля выхаду першай гербавай серыі марак, у 1947 годзе, пошта выпусціла другую такую серыю. Цяпер мініяцюр было 17 — адна марка паказвала Дзяржаўны герб СССР і 16 марак — гербы саюзных рэспублік.

На цёмна-зялёнай марцы было дадзена адлюстраванне герба БССР са змененым рысункам і надпісамі. Такое самае адлюстраванне герба БССР паказана на дзвюх мініяцюрах, выпушчаных у 1949 годзе ў сувязі з 30-годдзем рэспублікі.

У наступныя гады маркі з адлюстраваннем герба нашай рэспублікі выдаваліся да юбілеяў утварэння СССР, Канстытуцыі, да 100-гадовага юбілею Сусветнага паштовага саюза, 50-годдзя Кастрычніка.



Таксама неаднаразова на марках і канвертах нашай пошты давалася адлюстраванне дзяржаўнага флага БССР, які з 1919 года мяняўся некалькі разоў. Але толькі апошні яго варыянт паказаны на марках. Першыя флагі савецкіх рэспублік не мелі яшчэ эмблемы сярпа і молата. Палотнішчы флагаў былі чырвонымі, і ля дрэўка ўверсе золатам (жоўтым колерам) была вышыта назва саюзнай рэспублікі. У 1919 годзе на флагу нашай рэспублікі былі вышыты чатыры літары «ССРБ»—Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь. У снежні 1922 года быў утвораны СССР. Усе рэспублікі, што ўвайшлі ў склад Саюза, неўзабаве заснавалі свае дзяржаўныя флагі. На флагу нашай рэспублікі з'явіўся надпіс «БССР» уверсе ля дрэўка. Гэты флаг праіснаваў да канца 30-х гадоў. На паштовых матэрыялах ён не адлюстраваны.

У канцы 30-х гадоў на флагу нашай рэспублікі з'явілася над абрэвіятурай «БССР» эмблема ў выглядзе пяціканцовай зоркі, сярпа і молата ў залацістым колеры.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны былі распрацаваны новыя ўзоры дзяржаўных флагаў саюзных рэспублік. На іх захавалася эмблема — пяціканцовая зорка і перакрыжаваныя серп і молат, але каб адлюстраваць нацыянальныя асаблівасці рэспублік, увялі каляровыя палосы. Новы дзяржаўны флаг БССР быў зацверджаны Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі ў снежні 1951 года. Упершыню флаг БССР быў паказаны на паштовых выпусках у 1955 годзе ў серыі «Павільёны саюзных рэспублік на сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве».

У наступныя гады на многіх паштовых марках і канвертах быў паказаны Дзяржаўны флаг БССР. Гэта выпускі, прысвечаныя 900-годдзю горада Мінска, 20-годдзю вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў, 50-годдзю Кастрычніка, 60-годдзю ўтварэння СССР, БССР і Кампартыі Беларусі, і на многіх іншых выпусках, якія адзначылі юбілейныя даты ў жыцці краіны і рэспублікі.

Дзяржаўны флаг БССР паказаны і на замежнай паштовай марцы. У 1980 годзе паштовая адміністрацыя ААН зрабіла філатэлістам сюрпрыз — была выпушчана першая флагавая серыя марак з эмблемамі дзяржаў — членаў гэтага міжнароднага супольніцтва. Праграма выпуску разлічана на 10 гадоў, кожны год вырашана выпускаць па 16 марак. Флагі якіх дзяржаў паказваць у той ці іншы год, вырашае жэрабя.

У 1982 годзе была выпушчана марка з флагам Украінскай ССР, а ў верасні 1983 на паштовай марцы ААН з'явілася адлюстраванне дзяржаўнага флага нашай рэспублікі. У спецыяльным камюніке паштовай службы ААН да выпуску флагавай серыі 1983 года ўказвалася, што Беларуская ССР была ў ліку заснавальнікаў ААН і сёння адыгрывае важную ролю ў гэтай арганізацыі.

**Леў КОЛАСАЎ.**

## спорт

Усё часцей і часцей прыходзяць паведамленні аб спаборніцтвах па зімніх відах спорту. Першай «ластаўкай» для беларускіх аматараў стала інфармацыя з Заходняга Берліна аб удзеле канькабежца мінчаніна Ігара Жалязоўскага ў розыгрышы Кубка свету. Наш зямляк вызначыўся на кіламетровай дыстанцыі, дзе стаў пераможцам. А на «пяцісотцы» ён быў пятым.

Прыемным сюрпрызам стала выступленне хакеістаў мінскага «Дынама» ў першынстве краіны. Пасля першага этапу яны ўвайшлі ў дзесятку мацнейшых, якая ў наступным годзе разыграе медалі.

А вось гэта паведамленне, напэўна, і ўзрадуе, і засмуціць балельшчыкаў. Падлічана, што ў вышэйшай лізе за многія каманды краіны гуляюць больш за 40 выхаванцаў беларускай школы хакея. Некаторыя з іх у розныя гады запрашаліся ў зборныя СССР. Але ў апошні час на нашых спартсменаў звярнулі ўвагу і замежныя спецыялісты. Сёлета паехаў гуляць за французскі клуб «Рэймс» Сяргей Тукмачоў. НХЛ дэлегіруе свайго прадстаўніка на традыцыйны міжнародны турнір на прызы газеты «Известия», каб наладзіць... «агледзіны» мінчаніну Юрыю Крываціжу. Але запрашэнні замежных менеджэраў і трэнераў іншых клубаў краіны беларускіх хакеістаў значна аслабляюць моц «Дынама». Добра яшчэ, што падрастаюць маладыя, здольныя спартсмены і ёсць каму папаўняць рады галоўнай каманды рэспублікі.

Як вядома, чарговы чэмпіянат свету па біятлону пройдзе ў Раўбічах пад Мінскам у лютым наступнага года. Савецкія спартсмены пачынаюць адборачныя спаборніцтвы, якія вызначаць канчатковы састаў зборнай СССР. На першым этапе такіх спаборніцтваў, што прайшлі ў Новасібірску, вызначыліся і прадстаўнікі нашай рэспублікі: С. Булыгін, Г. Карпінкін, С. Парамыгіна, В. Образава.

У заключэнне паведамім нашым чытачам аб выступленні беларускіх спартсменаў за мяжой па іншых відах спорту. Найперш варта адзначыць поспех зборнай СССР на розыгрышы Суперкубка ў ГДР па гандболу. Нашы спартсмены ў фінале дамагліся перамогі над камандай гаспадароў — 35:21. Вельмі ўдала гулялі тут мінчане А. Тучкін, А. Каршакевіч, К. Шараваў, М. Якімовіч, Г. Свірыдзенка.

На турніры па гандболу сярод дзяўчат у Польшчы гонар нашай краіны абараняла каманда школы алімпійскага рэзерву з Мінска. Яна правяла пяць сустрэч і ўсе выйграла.

У Парыжы чэмпіянат Еўропы па тэнісу сярод жанчын прынёс поспех зборнай СССР — першае месца. У складзе нашай каманды была і Наталля Зверава.

З «бронзай» вярнуліся спартсмены Мінскага радыётэхнічнага інстытута з міжнароднага турніру па баскетболу ў Дубліне. У барацьбе за трэцяе месца беларускія спартсмены перамаглі каманду «Мурэй» з Шатландыі з лікам 91:88.

На спаборніцтвах па спартыўнай гімнастыцы ў Токіо мінчанін Віктар Шчэрба перамог у апорным скачку —9,8 бала.

У Венгрыі прайшоў адкрыты чэмпіянат гэтай краіны па гексагальных шахматах. Тут поспеху дамогся беларускі спартсмен Вячаслаў Яненка. Ён заняў першае месца.

## ВАС ШУКАЮЦЬ І ЧАКАЮЦЬ СВАЯКІ

Шукаецца сям'я **БУДЫ Мікалая Тарасавіча,** які нарадзіўся ў 1916 годзе ў вёсцы Дзямідава Віцебскай вобласці. Вядома, што ў 1939 годзе ён служыў капралам у польскай арміі. З пачаткам другой сусветнай вайны звесткі аб ім згубіліся.

Пасля вайны некаторы час ад яго прыходзілі пісьмы з Англіі. З іх вядома, што ён меў сям'ю: жонку, сына і дачку.

Іх шукае стрыечная сястра Буды Мікалая Тарасавіча (дачка Буда Антаніны).

Просім усіх, каму што-небудзь вядома пра сям'ю М. Буды, паведаміць у рэдакцыю або па адрасу:

**211910, БССР, Віцебская вобласць,**
**г. Дзісна, вул. Юбілейная, д. 41.**
**ЛІЗДЗЕНІС Раісе Сямёнаўне.**

**ПЕСІНА Фрума Шоламаўна** шукае свайго брата, які нарадзіўся ў 1925 ці 1926 годзе ў ЗША. Іх бацька, Песін Шолам, выехаў у ЗША ў 1913 годзе. Жыў у Нью-Йорку, Вашынгтоне, працаваў пекарам-кандытарам. Памёр у 70-х гадах.

Просім усіх, каму што-небудзь вядома пра лёс Шолама Песіна і яго сям'і, паведаміць у рэдакцыю ці па адрасу:

**220116, БССР, г. Мінск, праспект «Праўды», д. 15, кв. 117.**
**ПЕСІНАЙ Фруме Шоламаўне.**

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

**НАШ АДРАС:**

**220600, МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.**

**ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854 Зак. 1392